опыта, который у нашего молодого государства еще не так велик, и при всей схожести существующих моделей в различных государствах имеются и свои существенные отличия.

**Литература**

1. Rushworth, D. Mapping in Support of Frontier Arbitration: Delimitation and Demarcation [Electronic resource] / D. Rushworth — Durham University, 1997. — Mode of access : https://www.dur.ac.uk/resources/ibru/publications/full/bsb5-1_rushworth.pdf. — Date of access : 12.10.2016.

2. Curzon, Lord, of Kedleston. Romanes Lectures: Frontiers / Curzon Lord of Kedleston. — Oxford: Clarendon Press, 1907. — Mode of access : https://archive.org/details/frontiers00curz. — Date of access : 15.09.2016.

## Ляхавічы ў XVI–XVIII ст.: горад ці мястэчка

*Булаты П. Ю., асп. РІВШ,*
*навук. кір. Любая А. А. канд. гіст. навук, дац.*

Пры даследаванні гісторыі беларускіх гарадскіх паселішчаў паўстае праблема, якая датычыцца ўжывання пэўных паняццяў і тэрмінаў, а менавіта «горада» і «мястэчка»: у айчынай гістарыяграфіі няма дакладных вызначэнняў, што лічыцца горадам, а што мястэчкам. Адносна дакладная трактоўка «мястэчка» акрэсліваецца ў пастанове Варшаўскага Сойма аб генеральным падымным за 1775 г., дзе ўсе гарадскія пасяленні Рэчы Паспалітай падзяляліся на тры групы: вялікія гарады, малыя гарады і мястэчкі. Адзначалася, што «*miasteczka mają się rozumieć te, które samym się rolnictwem bawią y maiey iak trzysta kominow liczą*» [1, с. 88].

Прыведзеная вышэй трактоўка аказала значны ўплыў на фарміраванне вызначэння «мястэчка» большасцю сучасных даследчыкаў. Пры аналізе структуры гарадскіх паселішчаў Вялікага Княства Літоўскага ў XV–XVIII ст. З. Капыскі прапанаваў у якасці галоўнага крытэрыя, каторы адрознівае мястэчка ад горада, разглядаць заселенасць. Адзначаецца, што для мястэчак уласцівая невялікая люднасць — не больш за 300 дымоў [2].

Абапіраючыся на дадзены крытэрый, адзначым, што Ляхавічы можна акрэсліць як мястэчка: колькасць дымоў тут цягам двух стагоддзяў вар’іруецца ад 215 да 276 [3].

Аднак, як адзначае даследчык Юрый Бохан, у рэальным жыцці колькасць жыхароў (адпаведна, і дымоў) мястэчка залежала ад перыяду і рэгіёна [4, с. 335]. Дадзены крытэрый, на нашу думку, трэба разглядаць асобна для кожнага паселішча. У выпадку з Ляхавічамі ён не з’яўляецца досыць аб’ектыўным у сувязі з тым, што за два стагоддзі Ляхавічы станавіліся зонай баявых дзеянняў (вайна 1654–1667 гг., Паўночная вайна, Барская канфедэрацыя) і

былі амаль цалкам разбураныя, з-за чаго кожны раз дымы трэба было аднаўляць літаральна з нуля. Напрыклад, пасля вайны 1654–1667 гг. у Ляхавічах налічвалася толькі 17 дымоў [5, табл. 43].

У сучаснай айчынай гістарыяграфіі прадстаўлены шэраг крытэрыяў, якія характэрны для паселішчаў са статусам «горад» і якім адпавядаюць Ляхавічы:

1) статус гарадоў XVI–XVIII ст. вылучаецца па іх назвах у пісьмовых крыніцах [6, с. 12]. Так, у прывілеі Жыгімонта Аўгуста Я. Г. Хадкевічу пры абмене Ляхавічаў на Свіслач дакладна вылучаецца дыферэнцыяцыя паміж замкам і местам Ляхавічы [5, с. 67]. Паняццем «места» абазначана невялікае ўтварэнне, якому ў XVI ст. надаецца гарадскі статус. У рамках тыпалагічнай схемы па памерах гэта — у асноўным невялікія гарады, якімі, як правіла, з'яўляліся менавіта прыватнаўласніцкія паселішчы з ускладненай сацыяльна-тапаграфічнай структурай [6, с. 13].

2) адной з галоўных рыс горада з'яўлялася наяўнасць абарончых збудаванняў [6, с. 55]. Першапачаткова ў Ляхавічах знаходзіліся дрэва-земляныя ўмацаванні, а потым у горадзе была ўзведзена каменная фартэцыя. Многія беларускія гарады развіваліся з магнацкіх замкаў, цэнтрам паселішча з'яўляўся дзядзінец, атачоны абарончымі збудаваннямі. Побач узнікаў вакольны горад, побач з якім утваралася другая лінія ўмацаванняў і пасады. Пра наяўнасць вакольных умацаванняў і пасадаў сведчыць у сваёй працы, прысвечанай ляхавіцкай фартыфікацыі, гісторык Міхась Ткачоў [3].

3) для горада характэрна складаная структура насельніцтва [7]. Ляхавічы з'яўляліся месцам пражывання прадстаўнікоў розных хрысціянскіх канфесій: каталікоў, грэка-каталікоў, пратэстантаў, а таксама іншых народаў — габрэяў, татар [8].

4) горад характарызаваўся ускладненай сацыяльна-тапаграфічнай структурай [6, с. 13]. Непадалёку ад горада часта знаходзіўся курганны могільнік (у крыніцах адзначаецца наяўнасць некропаля за межамі Ляхавічаў [9]). Побач з замкавымі пабудовамі знаходзіўся рынак, у горадзе былі корчмы і лаўкі. З пашырэннем хрысціянства Ляхавічы сталі рэлігійным і культурным цэнтрам.

5) для жыхароў горада было характэрна аб'ядноўвацца ў рэлігійныя супольнасці: у Ляхавічах дзейнічала цягам двух стагоддзяў каталіцкае брацтва Святой Ганны.

Такім чынам, зыходзячы з прыведзеных крытэрыяў, мы адносім Ляхавічы перыяду XVI–XVIII ст. да паселішчаў са статусам «горад».

## Літаратура

1. Volumina legum, T. 8. — Pb., 1860.

2. Копысский, З. Ю. Экономическое развитие городов Белоруссии в XVI — первой половине XVII в. / З. Ю. Копысский. — Минск: Наука и техника, 1975. — 188 с.

3. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Ляхавіцкага раёна / Бел. Сав. Энц. Рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд) [і інш.]. — Мн. : БелСЭ, 1989. — 439 с.

4. Бохан, Ю. Мястэчка / Юры Бохан // Вялікае Княства Літоўскае. У 3 т. Т.2 / Рэдкал. : Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. — 2-е. выд. — Мінск : БелЭн, 2007, — С. 334–335.

5. Morzy, J. Kryzys demograficzny na Litwie i Białorusi w drugiej połowie XVII w. / Jerzy Morzy. — Poznań, 1965. — 395 s.

6. Археалогія Беларусі. У 4 т. Т.4. Помнікі XIV–XVIII стст. / Пад рэд. В. М. Ляўко [і інш.]. — Мінск : Беларуская навука, 2001. — 597 с.

7. Соркіна, І. Праблема тэрміналогіі пры вывучэнні гісторыі паселішчаў Беларусі / Іна Соркіна // Гістарычны альманах, Т.9, 2003. — С. 36–43.

8. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. — Ф. 1781. Воп. 27. Спр. 223.

9. Описание церквей и приходов Минской епархии 1878/79 гг. — Минск, 1879.

## Фаддей Булгарин — популяризатор польской культуры в Российской империи

*Воднева Е. В., студ. V к. БГУ,*
*науч. рук. Луговцова С. Л., канд. ист. наук, доц.*

Фаддей Булгарин (1789–1859) — известный российский писатель, талантливый журналист, критик, издатель и редактор первой частной газеты в Российской империи.

Первые попытки литературной деятельности Фаддея Булгарина известны со второй половины 1810-х гг. В это время он, полный энергии молодой человек, находился в поисках места под солнцем. Начало публицистической карьеры было связано с сотрудничеством с польскими литераторами и использованием их материалов. Ф. Булгарин начал писать на родном польском языке, но имел успех в узких кругах в Вильно, там прославиться ему не удалось. Тогда он отправляется в Петербург и решает заняться в первую очередь редакторской деятельностью, в которой увидел возможность реализовать свои возможности и занять в последующем определенное социальное положение. Здесь молодой человек продолжает знакомить публику с работами польских литераторов и исследователей, тем самым делая первые шаги для налаживания отношений между русским и польским народами.

«Краткий обзор польской словесности», опубликованный в 1820 г. в «Сыне Отечества», стал одной из первых статьей Булгарина по польской тематике, в которой он высоко оценил наследие польской литературы [1].

После нескольких историко-публицистических опытов он начал издавать журнал, посвященный истории и статистике, — «Северный архив». Именно